Петербургской консерватории внес столь существенной вклад в дело сохранения и изучения народных музыкальных инструментов и инструментальной музыки.

**Список литературы:**


1. 216 народных украинских напевов / записал и издал А. И. Рубец. – М. : Печ. Юргенсона, 1871. – 55 с.
2. К. Ф. У. О. Кобзарь Остап Вересай, его думы и песни // Киевская старина : ежемес. ист. журнал. – 1882. – Т. 1, № 8. – С. 259 – 282. – Режим доступа : Институт высоких технологій. Київський національний університет імені Тараса Шевченка. URL: http://iht.univ.kiev.ua/library/ks/1882/pdf/kievskaya-starina-1882-8-A-(1574-1598).pdf. – Дата обращения: 10.12.2013.
3. Народные музыкальные инструменты музея Санкт-Петербургской консерватории / исслед. с политипажами и нотами в тексте М. Петухова. – СПб. : Тип. Императорской Акад. наук, 1884. – 56 с.
4. Отчет Петербургского отделения Русского музыкального общества за 1874–1875 гг. – СПб. : Тип. Голике, 1876. – 113 с.
5. Отчет Петербургского отделения Русского музыкального общества за 1878–1879 гг. – СПб. : Тип. Голике, 1880. – 200 с.
6. Отчет Петербургского отделения Русского музыкального общества за 1879–1880 гг. – СПб. : Тип. Голике, 1881. – 200 с.
7. Отчет Петербургского отделения Русского музыкального общества за 1880–1881 гг. – СПб. : Тип. Голике, 1882. – 206 с.
8. Рубец, А. И. Сборник 100 украинских народных песен : в 5 вып. – М. : Юргенсон, 1894. – Вып. 1 – 5. – 212 с.
9. Сборник украинских народных песен / сост. А. И. Рубец. – СПб.: Тип. Черкесова, 1870. – Вып. 1. – 35 с.; Вып. 2. – 41 с. ; 1872. – Вып. 3. – 35 с. ; М. : Печ. Юргенсона, 1882. – Вып. 4. – 28 с.



***Тацяна Пладунова***


## ДА ПЫТАННЯ ТЫПАЛОГІІ ТЭМБРАЎ ВАКАЛЬНАЙ ЭТНАФОНІІ БЕЛАРУСАЎ


*У дадзеным артыкуле зроблена спроба прадставіць багацце традыцыйнага вакальнага майстэрства Беларусі як панараму рэгіянальных гукаідэалаў, кожны з якіх змяшчае ў сабе разнастайныя эталоны гучання.*



***Tatiana Plodunova***


## TO THE QUESTION ON TIMBRES TYPOLOGY ON VOACAL ETHNOPHONY OF THE BELARUSIANS


*This article attempts to provide the diversity of traditional vocal skills in Belarus as a panorama of regional ideals of sound, each of them contains a variety of sound standards.*


Праблема захавання традыцыйнай спеўнай культуры беларусаў як адной з культурна-гістарычных адметнасцей народа зразумелая спецыялістам культурна-адукацыйнай сферы. Адпраўным крокам па засваенні вакальнай этнафоніі[32] з'яўляецца асэнсаванне эстэтыкі народна-песеннага мастацтва, яго сацыяльна-дэтэрмінаванай прыроды. У працэсе вывучэння ўзораў этнафоніі даследчая і эксперыментальная педагічная дзейнасць арыентуецца на так званы традыцыйны гукаідэал[33].

Спеўную этнафонію беларусаў магчыма прадставіць як панараму рэгіянальных гукаідэалаў, кожны з якіх змяшчае разнастайныя *эталоны* гучання. Традыцыйны гукаідэал ў рамках лакальнай традыцыі характарызуецца пэўным наборам *этнафанічных эталонаў,* якія адлюстроўваюць функцыянальна-семантычны змест традыцыйнай спеўнай культуры. Эталонныя гучанні, у сваю чаргу, вымалёўваюцца пэўнымі музычна-выразнымі сродкамі: дынамікай, вышынёй, атакай, тэмбрам, тыпам інтанавання, інш.

Найбольшую цікавасць выклікае пытанне фарміраванне тэмбравай палітры гучання. Аднак у сучаснай фалькларыстыцы абгрунтаваная тыпалогія тэмбраў вакальнай этнафоніі яшчэ не склалася. Апошнія работы, у якіх надаецца ўвага тэмбравым характарыстыкам фальклорных напеваў, заснаваныя на ўсведамленні факту асаблівай важнасці дадзенай з'явы традыцыйнай культуры. Так, даследчык традыцыных спеваў народаў Сібіры В. В. Мазепус распрацаваў арыгінальную методыку артыкуляцыйна-акустычнага вызначэння тэмбраў і пастуліруе наступны прынцып класіфікацыі галасавых тэмбраў: Універсальнае значэнне мае артыкуляцыйны прынцып вызначэння тэмбру. Сутнасць яго заключаецца ў тым, што фіксуецца не сам тэмбр, а ***спосаб яго***

[32]Тэрмін *"э т н а ф о н і я"* ( ад грэч. εσυοs – народ, φωυή – гук) упершыню прымяніў украінскі этнамузыколаг К.В.Квітка ў дачыненні да этнічнай спецыфікі тэмбравых асаблівасцяў гуку. У сучасных даследаваннях па музычнай фалькларыстыцы тэрмін этнафонія шырока выкарыстоўваюць для вызначэння стыляў і манер выканання [1, 464].

[33]Тэрмін "традыцыйны гукаідэал" (уведзены Фр.Бозе) абагульняе спецыфічныя элементы вакальных і інструментальных стыляў, характэрныя для кожнай этнічнай культуры, у пэўную інтанацыйна-тэмбравую мадэль традыцыі і складаецца з такіх значных формаўтваральных фактараў як дынаміка, тэмбр, спосаб і манера гукавымання, своеасаблівасць музычнай інтанацыі, алгарытм рухальнай дынамікі музычнага выказвання (1, 158).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***здабывання***. У прымяненні да інструментальнай музыкі гэты прынцып добра вядомы і зводзіцца да дэталевай фіксацыі выканальніцкіх штрыхоў, што дазваляе ўзнавіць зададзены тэмбр з неабходнай дакладнасцю, калі вядомыя канструкцыя і акустычныя ўласцівасці інструмента. Пры аналізе тэмбраў, якія выпрацоўваюцца вакальна-маўленчым апаратам чалавека, уяўляецца эфектыўнай некалькі пашыраная і удакладненая артыкуляцыйная класіфікацыя» [2, с. 26].

У прымяненні падобнага тэмбрава-артыкуляцыйнага метаду да вывучэння і засваення беларускай вакальнай этнафоніі аўтар дадзенага артыкула мае наступныя метадычныя напрацоўкі.

У практыцы па засваенні лакальных этнафанічных традыцыйпраца ў студэнцкім фальклорным гурце Этна-Суполка(кіраўнік Т.А. Пладунова) спецыялізацыі Этнафоназнаўстваідзе ў трох напрамках: 1. эмацыйнае пагружэнне ў музычна-паэтычны свет песень; 2. вылучэнне функцыянальна-семантычных слаёў акустычнага коду традыцыі; 3. выбудова сістэмы метадаў і тэхнік гукатварэння.Кожны з напрамкаў варты апісання, але апошні, тэхналагічны,  нас цікавіць з пункту гледжання фарміравання тэмбра як аднага з параметраў акустычнага коду традыцыі.Вось некторыя рэкаендацыі па выпрацоўцы тэмбраў пеўчага голасу паводле лакальных этнафанічных традыцый беларусаў.

*Пеўчыя пазіцыі паводле этнафанацыі*

Працэс пеўчай фанацыі працякае ва ўмовах той ці іншай акустычнай сістэмы – фанацыйнага апарата – артыкулятары якога, у сваю чаргу, выбудоўваюць належныя форма-аб'ёмы яго рэзанатараў як рэзервуараў гукавой энэргіі. У фарміраванніформ і аб'ёмаў рота-глоткавых рэзанатараў удзельнічае важны фактар – пеўчая пазіцыя, якая задае, так бы мовіць, архітэктурны праект фанацыйнага апарата(гукавога хвалявода). Пеўчая пазіцыя выступае як артыкуляцыйная устаноўка рота-глоткавага канала, яна ўсталёўваецца рухальнай дынамікай языка па гарызанталі рота-глоткавай паласці (ад задняй сценкі глоткі да верхніх зубоў). Прымяніўшы фанетычную класіфікацыю гукаўтварэння, выдзяляем тры асноўныя пеўчыя пазіцыі, якія ўсталёўвае рухальная дынаміка языка па гарызанталі рота-глоткавай паласці (ад задняй сценкі глоткі да верхніх зубоў):

1. Заднеязычная (заглыбленая)
2. Сярэднеязычная (аптымальная маўленчая)
3. Пярэднеязычная (маўленчая на ўсмешцы).

Пеўчая пазіцыя – своеасаблівая мадэль папярочніка гартаннай трубы, які фіксуецца адпаведнымі часткамі языка, зёва, сківіц, сценак глоткі. Гартанную трубу магчыма ўявіць як трансформер, які можна стыбільна усталяваць і свабодна вар'іраваць аб'ёмы з шырокім, сярэднім, вузкім сячэннем папярочніка гартаннай трубы (у аўтэнтычных носьбітаў гэта атрымліваецца надзвычай імправізацыйна). Так у фанацыйным апараце кожнага чалавека патэнцыяльна змешчаны віртуальны камплект эластычных трубак з розным папярочным сячэннем, падобны да камплекта духавых інструментаў.

На наш погляд, заднеязычная "заглыбленая" пеўчая пазіцыя характэрна для спеваў асобных раёнаў Брэсцкага Палесся (напрыклад, Пінскі і Лунінецкі раёны), а пярэднеязычная – для лакальных традыцый Магілёўскага Падняпроўя (напрыклад, Слаўгарадскі раён) і Гродзенскага Панямоння (Дзятлаўскі, Шчучынскі, Воранаўскі раёны), сярэднеязычная пеўчая пазіцыя у рознай ступені варыятыўнасці пераходаў да пярэднеязычнай ці заднеязычнай назіраецца ў выканальніцтве Віцебскага Падзвіння і Міншчыны, аднак сустракаецца і ў лакальных традыцыях іншых рэгіёнаў (Веткаўскага Пасожжа, Гомельскага і Брэсцкага Палесся).

*Арытыкуляцыі пры этнафанацыі.*

Пеўчая фанетыка, уласцівая розным вакальным традыцыям значна адрозніваецца ад маўленчай. Хаця зыходны матэрыял ў маўленні і ў спевах аднолькавы - гукі мовы. Але у спевах ён артыкуляцыйна адрозніваецца ад маўленчага арыгінала, нават вельмі значна.

У беларускай мове 6 галосных гукаў, якія выдзяляюцца пад націскам: [і], [ы], [а], [э], [о], [у]. Акустычныя адрозненні паміж імі вызначаюцца аб'ёмам і формай рэзанансных локусаў, якія могуць моцна змяняцца ў выніку пэўных рухаў языка і губ. Язык рухаецца па гарызанталі (уперад, да ніжніх зубоў і ў адваротным напрамку) і па вертыкалі (падымацца да цвёрдага паднябення ў большай ці меншай ступені). Гэтыя два напрамкі рухавай дынамікі языка шчыльна звязаны: прасоўванне ўперад альбо назад звычайна суправаджаецца з адначасовым большым-меншым падняццем угору, што якасна змяняе форму і аб'ём рота-глоткавага хвалявода, а значыць і інтэнсіўнасць абертанальнага спектра яго рэзанатараў. Ад ступені падымання языка залежыць і ступень раскрыцця рота: пры ніжнім пад'ёме (галосныя «а»,« о») - самае шырокае раскрыццё; пры верхнім - самае вузкае (галосныя «і», «у»), пры сярэднім пад'ёме (галосныя «ы», «э») - сярэдняе раскрыцце рота.

Па назіраннях аўтара тыя ці іншыя артыкуляцыйныя жэсты ў рэжыме той ці іншай пеўчай пазіцыі афармляюцца ў адметную для свайго рэгіёна ***артыкуляцыйную мадэль***: **О**-падобная, **А**-падобная, **Э**-падобная, **І**-падобная, **Ы**-падобная артыкуляцыйныя мадэлі – своеасаблівыя архітэктурныя праекцыі фанацыйнага хвалявода.Таму пры стабільнасці артыкуляцый у рамках той ці іншай мадэлі яна не носіць характар застыўшай формы, а як бы нагадвае артыкуляцыйны эскіз. Вось некаторыя з базавых артыкуляцыйна-тэмбравых мадэляў этнафанацыі, вылучаных аўтарам на аснове вывучаемых лакальных этнафанічных традыцый:

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

**О**-падобная артыкуляцыйная мадэль



Пры ўтварэнні **О**-падобнай артыкуляцыйнай мадэлі ніжняя сківаца апушчана, росчын рота пры (о) шырэй, чым пры (у), але вузейшы, чым пры (а); язык пры ўтварэнні (о) адсунуты назад і сваёю задняй часткай падымаецца да мяккага паднябення, аднак у меншай ступені, чым пры (у); кончык языка адсунуты назад ад ніжніх зубоў; корань языка адцягнуты да задней стенкі глоткі. Губы акругленыя, утвораная губамі гукавылучальная адтуліна мае меншы дыяметр у параўнанні з (а)-падобнай. Тэмбральны спектр насычаны нізкімі абртонамі.

**А**-падобная артыкуляцыйная мадэль



Пры ўтварэнні **А**-падобнай артыкуляцыйнай мадэлі ніжняя сківаца апушчана ў большай ступені за іншыя галосныя гукі. Усувязі з гэтым рот раскрыты шырока, зноў жа, шырэй чым пры фарміраванні іншых галосных.Спінка языка крыху прагібаецца ў сярэдзіне, таму задняя яе частка прыпаднятая. Губы пасіўныя, не выпячваюцца ўперад і адкраваюць зубы, таму гукавылучальная адтуліна рэзанатара ўтвараецца зубамі. Пры ізаляваным вымаўленні галосны [а] не лакалізуецца па месцы под'ёма языка, але часцей за ўсё яго адносяць да ніжняга под'ёму і сярэдне-задняга раду.Тэмбральны спектр прадстаўляе раўнавагу высокіх і нізкіх абертонаў.

**Э**-падобная артыкуляцыйная мадэль



[е]

Пры ўтварэнні **Э**-падобнай артыкуляцыйнай мадэлі ніжняя сківаца апушчана ў большай ступені чым пры ўтварэнні (і), і ў меншай, чым пры (а); таму росчын рота пры (э) шырэй за (і), і вузейшы за (а); язык прасунуты наперад і прыпадымаецца сваёй сярэдняй часткай да цвёрдага паднябення., аднак у меншай ступені, чым пры (і), губы пасіўныя.
Язык у становішчы сярэдняга пад'ёму пярэдняга раду.
Тэмбральны спектр насычаны высокімі абертонамі.

Вызначаныя тэмбрава-артыкуляцыйныя мадэлі з'яўляюцца базавымі, на аснове якіх магчыма даследаваць іх варыянты:

**О**- падобная мадэль «шырокая» (спалучае артыкуляцыі галоснага **О***сярэдняга пад'ёму* задняга раду з характэрыстыкамі **А***нізкага пад'ёму*)

**А** – падобная мадэль «глыбокая» (**А** нізкага пад'ёму *сярэдняга раду*пераймае рысы *заднераднага*галоснага **О**)

**А** – падобная мадэль «на ўсмешцы» (**А** нізкага пад'ёму *сярэдняга раду*пераходзіць у *пярэдні рад* як у галосным **Э**), інш.

Варыятыўнасць тэмбрава-артыкуляцыйных мадэляў пеўчай фанацыі даволі разнастайная нават у межах аднаго арэала, што дае перспектыву для стварэння разгорнутай тыпалогіі тэмбраў беларускай вакальнай этнафоніі. Вынікі гэтай эксперыментальнай працы яшчэ наперадзе, аб чым аўтар паведаміць у матэрыялах наступных канферэнцый.

**Спіс літаратуры:**


1. Восточнославянский фольклор : словарь науч. и нар. терминологии / редкол. : К. П. Кабашников (отв. ред.) и др. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 189 с.
2. Мазепус, В. В. Артикуляционная классификация и принципы нотации тембров музыкального фольклора / В. В. Мазепус // Фольклор. Комплексная текстология. – М. : Наследие, 1998. – С. 34.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ